**С. М. Тычына**

# МАСТАЦКІЯ АСАБЛІВАСЦІ АНГЛІЙСКАЙ ФІЛАСОФСКАЙ КАЗКІ (на прыкладзе казак О. Уайльда)

Нягледзячы на тое, што з'яўленне літаратурных казак непасрэдна звязана з фальклорам, мастацкія асаблівасці казак, якія маюць канкрэтнага аўтара, могуць дастаткова моцна адрозніваецца ад асаблівасцей народных казак. Гэтыя адрозненні адзначаў і У. Пропп у кнізе "Марфалогія чароўнай казкі", калі пісаў пра функцыі дзеючых асоб у народных казках. Даследчыкі М. Ліпавецкі, Т. Леонава, Б. Бегак у сваіх работах падкрэслівалі, што літаратурная казка не проста арыентуецца на народную казку, але і можа ўключаць элементы філасофскага рамана, аповесці, байкі, прытчы і іншых літаратурных жанраў.

Літаратурныя казкі на першы погляд падобныя да народных казак (асабліва тады, калі аўтар выкарыстоўвае пэўную стылізацыю пад фальклорныя тэксты або бярэ фальклорны сюжэт і, перапрацаваўшы яго, піша свой твор). Аднак часцей за ўсё на літаратурныя казкі накладвае адбітак асоба аўтара і яго творчая індывідуальнасць (у той час як у народных казках з-за таго, што яны пераказваліся і апрацоўвалася многімі людзьмі, гэтая індывідуальнасць паступова знікае). Мае істотнае значэнне і час, калі ўзнікае тая або іншая літаратурная казка, а таксама той факт, што ў адрозненне ад казкі народнай, літаратурная казка, як правіла, не існуе ў вуснай форме, а таму не падвяргаецца тым зменам, якія становяцца магчымымі пры пераказе чарадзейнай гісторыі рознымі людзьмі. Так што такія казкі не зблытаеш з іншымі (напрыклад, казкі О. Уайльда настолькі вылучаюцца сваім стылем, асаблівасцямі выкладання падзей, сваімі вобразамі, што іх аўтара вельмі лёгка пазнаць).

Асаблівае месца сярод літаратурных казак займае філасофская казка, якая закранае анталагічныя праблемы, заклікае задумацца над пытаннямі, звязанымі з вызначэннем і выяўленнем самога сябе, і мае выразны прытчавы пачатак. Да такіх казак варта аднесці творы Л. Кэрала ("Прыгоды Алісы ў краіне цудаў", "Праз люстэрка і што Аліса знайшла там"), О. Уайльда ("Салавей і ружа", "Кентэрвільскі прывід", "Рыбак і яго Душа", "Малады

кароль”, “Адданы сябар” і інш.), А. дэ Сэнт-Экзюперы (“Маленькі прынц”), Якуба Коласа (“Казкі жыцця”) і інш. Філасофскія казкі разлічаны на розную ўзроставую аўдыторыю, але іх глыбокі сэнс (асабліва калі аўтар не імкнецца выявіць яго выразна) можа зразумець у першую чаргу менавіта дарослы чалавек. Дзіцёнка філасофская казка можа засмуціць, паколькі вельмі часта ў такіх казках фінал можа быць нешчаслівым, неадназначным, або ў іх зло можа атрымаць перамогу над дабром (напрыклад, як у казках “Дзень нараджэння Інфанты”, “Адданы сябар” О. Уайльда ці “Балотны агонь” Якуба Коласа).

Акрамя названых прыкмет філасофскай казкі, можна адзначыць яшчэ і паглыбленне ва ўнутраны свет чалавека, яго перажыванні. Філасофская казка вельмі часта эмацыйна насычаная. Героі здзіўляюцца (у творы Л. Кэрала здзіўленне і цікавасць прымусілі Алісу пайсці за Белым Трусам, што выклікала шэраг падзей), засмучаюцца (у казцы Я. Коласа “Балотны агонь” бярозка моцна засумавала, калі вяз адкрыў ёй праўду пра агонь, які яна прымала за нейкі цуд і лічыла адзінай уцехай у жыцці), паміраюць ад душэўнага болю (у казцы “Дзень нараджэння Інфанты” О. Уайльда Карлік меркаваў, што прынцэса дорыць яму кветку таму, што кахае яго, але калі ён разумее, што яна проста смяялася з яго, то яго сэрца не вытрымлівае) і г.д. Дакладных правіл напісання філасофская казка не мае. Яна можа ўключаць фальклорныя традыцыі, спасылкі на гістарычныя падзеі (“Жывая вада” Якуба Коласа), сусветныя рэлігіі (“Велікан-эгаіст” О. Уайльда), мець элементы лінгвістычнай гульні (“Прыгоды Алісы ў краіне цудаў” Л. Кэрала).

Цікава, што жыццё і творчасць самых выбітных і вядомых англамоўных пісьменнікаў (Л. Кэрала і О. Уайльда), якія распрацоўвалі жанр філасофскай казкі, прыйшліся на другую палову XIX ст. Даследчыца англійскай літаратурнай казкі Н. Віктарава ў дысертацыі “Англійская літаратурная казка эпохі посмадэрнізму” указвае гэты час (а дакладней 1850–1880-я гг.), як першы перыяд развіцця англійскай літаратурнай казкі, адзначаючы з’яўленне вялікай колькасці разнастайных у жанравых адносінах аўтарскіх казак. Навуковец звяртае ўвагу і на перыяд з 1880 па 1915 гг. у развіцці літаратурнай казкі, асаблівасць якога вызначаецца спецыфікай літаратурнай сітуацыі ў Вялікабрытаніі. У гэты час усведамляюцца жанравыя магчымасці літаратурнай казкі і яе запатрабаванасць сярод розных катэгорый чытачоў. Філасофская казка прадстаўляе адзін з пяці жанравых відаў аўтарскай казкі таго часу. Як слушна заўважае даследчыца, казкі О. Уайльда моцна адрозніваюцца ад традыцыйнай англійскай казкі, што абумоўлена не ў апошнюю чаргу ўплывам эстэтызму.

Сярод мастацкіх асаблівасцей філасофскіх казак О. Уайльда можна адзначыць наступныя.

1. Умоўнасць паняццяў “дабра” і “зла”. У казцы “Рыбак і яго Душа” Рыбак адмаўляецца ад уласнай душы дзеля кахання марской Дзяўчыны. Вельмі цяжка ацаніць яго ўчынак з пункту погляду традыцыйнага ўяўлення пра “станоўчае” і “адмоўнае”. Ахвяраванне самым каштоўным (напрыклад, жыццём) для кахання – гэта подзвіг у імя любові. Але ахвяраванне

бессмяротнай душой – гэта грэх. Каханне робіць Рыбака шчаслівым, яго не цікавяць матэрыяльныя даброты, якімі спрабуе завабіць яго Душа, але ён здраджвае маленькай марской Дзяўчыне, спакусіўшыся аповедамі пра танцы і прыгожыя ножкі зямной дзяўчыны. Адзначым, што ў канцы твора нават Святар, які палічыў жыхароў мора, Рыбака і яго каханую нячыстымі, усвядоміўшы прыгажосць і моц кахання герояў, урэшце благаславіў усіх істот, якіх праклінаў.

2. Зварот да вечных каштоўнасцей. Нягледзячы на адноснасць паняццяў “дабра” і “зла” ў казках О. Уайльда падкрэсліваецца важнасць дабрыні (“Велікан-эгаіст”), спагады (“Кентэрвільскі прывід”, “Шчаслівы прынц”), кахання (“Салавей і ружа”, “Рыбак і яго Душа”), сяброўства (“Адданы сябар”) і г.д. Духоўныя каштоўнасці павінны стаяць вышэй за матэрыяльныя – такія высновы можна зрабіць, чытаючы казкі “Малады кароль”, “Шчаслівы прынц” і г.д. Але пры гэтым часам самі героі наадварот прыходзяць да думкі, што ў матэрыяльным больш сэнсу і лепш трымацца менавіта матэрыяльнага. Прынцэса ў казцы “Дзень нараджэння Інфанты” выказвае пажаданне, каб у тых людзей, якія будуць з ёю гуляць у будучыні, не было сэрца. Студэнт, для рэалізацыі пачуццяў якога салавей ахвяраваў жыццём, робіць заключэнне, што каханне – гэта глупства.

3. Ідэя пра тое, што прыгажосць вышэй за ўсё. Цікава, што дадзены прынцып эстэтызму ў казках О. Уайльда ўдакладняецца разуменнем таго, што знешняя прыгажосць павінна знаходзіцца ў гармоніі з унутранай прыгажосцю. Інакш гэтая прыгажосць пакідае адчуванне штучнасці (“Дзень нараджэнне Інфанты”, “Шчаслівы прынц”).

4. Наяўнасць псіхалагізму. Як ужо адзначалася, у філасофскіх казках важнай часткай з’яўляецца адлюстраванне ўнутраных перажыванняў герояў. У О. Уайльда героі часта перажываюць здраду, церпяць насмешкі, боль ад кахання, адзіноты, нейкай страты. Пісьменнік выяўляе песімістычны настрой: высакародныя ўчынкі герояў не цэняцца (“Адданы сябар”), жыццё можа аказацца згубленым марна (“Рыбак і яго Душа”, “Дзень нараджэння Інфанты”).

5. Неадназначная падача вобразаў герояў. Адмоўны персанаж можа гаварыць правільныя, узвышаныя словы, мець добрыя намеры і здавацца неблагім чалавекам (у тым ліку згодна з ацэнкай іншых персанажаў і яго самога). Асабліва яскрава гэта праяўляецца ў казцы “Адданы сябар” у вобразе Г’ю-Млынара, які спачатку выкарыстоўваў, а потым загубіў Маленькага Ганса.

6. Адсутнасць пакарання зла. Падступныя ўчынкі героя часта не маюць для яго наступстваў. Жыццё станоўчага персанажа страчана, адмоўны персанаж працягвае існаваць далей (“Дзень нараджэння Інфанты”, “Адданы сябар”).

7. Нешчаслівы ці неадназначны фінал. У вялікай колькасці казак О. Уайльда выяўлена меркаванне пра тое, што зло ўсё роўна возьме сваё. У казцы “Хлопчык-зорка” ў канцы аўтар паказвае раскайванне галоўнага героя, прымірэнне яго з бацькамі, яго спагадлівае, літасцівае і справядлівае

кіраванне краінай, выгнанне злога Чараўніка. Здаецца, на гэтым можна было б завяршыць твор, але фінальная фраза пра тое, што наступнік Хлопчыка-зоркі быў тыранам, выклікае адчуванне, што дабро не перамагло. Наогул тое, як заканчвае творы О. Уайльд, пакідае адчуванне незавершанасці і змушае паразважаць над творам.

8. Наяўнасць праблемы выбару. Героі мусяць выбіраць паміж тым, што патрэбна ім, і тым, што патрэбна іншым, часта ахвяруючы сабой (“Салавей і ружа”, “Шчаслівы прынц”, “Малады кароль”, “Адданы сябар”). Выбар герояў можа тычыцца духоўнага і матэрыяльнага, дабра і зла.

Такім чынам, можна адзначыць, што філасофскія казкі О. Уайльда маюць сваю спецыфіку, якая шмат у чым абумоўлена ўплывам эстэтызму. Казкі дазваляюць паразважаць над праблемамі жыцця, смерці, прызначэння чалавека ў свеце, над пытаннямі чалавечага шчасця, дабра і зла. О. Уайльд паказвае, што ў свеце няма дакладнага падзелу на цемру і святло, што не заўсёды магчыма перавыхаваць асобу і прымусіць яе ўсвядоміць каштоўнасць кахання, справядлівасці і міласэрнасці, важнасць выбару на карысць дабра, што чалавечы эгаізм і закасцянеласць у поглядах, якая не дае магчымасць адрозніць праведнае ад няправеднага, існавалі і будуць існаваць далей.